*Размова на актуальную тэму*

# ВЫНАХОДНІЦТВУ — АКТЫЎНАСЦЬ І ВЫСОКУЮ РЭЗУЛЬТАТЫЎНАСЦЬ

**Прафбюро фізічнага факультэта сумесна з рэдакцыяй шматтыражнай газеты вырашыла перыядычна адлюстроўваць на яе старонках ход правядзення сацыялістычнага спаборніцтва сярод факультэтаў і кафедр па вынаходніцкай дзейнасці, даваць неабходныя растлумачэнні па нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі, паведамляць аб вынаходніцтвах, якія зроблены ва універсітэце, аб новай патэнтнай літаратуры. На нашу думку, гэта павінна садзейнічаць не толькі актывізацыі вынаходніцкай дзейнасці, але і павышэнню ўзроўню ўсіх навукова-даследчых работ ва універсітэце.**

ПАСВЯХОВАЕ правядзенне навукова-даследчых работ па дзяржбюджэтнай і гаспдагаворнай тэматыцы патрабуе выканання комплексу мерапрыемстваў, састаўной часткай якіх з'яўляецца вынаходніцкая дзейнасць. Выдзеліць яе як самастойны напрамак работы немагчыма, паколькі яна арганічна звязана з усім ходам навуковых даследаванняў. Менавіта таму паказчыкі вынаходніцкай дзейнасці факультэтаў, кафедр і лабараторый адлюстроўваюць не асобныя бакі іх дзейнасці, а агульны ўзровень выконваемых работ, іх якасць і эфектыўнасць.

Аднак, як паказвае практыка, часта вынаходніцтва на кафедры і ў лабараторыях разумеецца ў вузкім сэнсе, зводзіцца толькі да афармлення і падачы заявак на магчымыя вынаходніцтвы. Пры гэтым сама дзейнасць разглядаецца як неабавязковая работа, «захапленне», якое толькі дае кафедрам і лабараторыям «патрэбныя» паказчыкі, а самім вынаходнікам нейкія асабістыя даброты. Іншы раз на сходах даводзіцца чуць крытычныя заўвагі аб нізкім узроўні вынаходніцкай дзейнасці ў асобных падраздзяленнях, як быццам размова ідзе аб якой-небудзь гаспдагаворнай тэме, а не аб аб'ектыўнай характарыстыцы ўсяго навуковага патэнцыялу падраздзялення. Разглядаць вынаходніцтва ў адрыве ад астатніх работ, крытыкаваць толькі яе нізкі ўзровень — гэта значыць гаварыць аб выніку, забываючы прычыну. Знаходзячыся ў дыялектычным адзінстве з усёй працоўнай дзейнасцю, вынаходніцтва характарызуе пастаноўку навукова-даследчых работ у падраздзяленнях. Прычым яе паказчыкі заснаваны на цэлай сітэме дзяржаўных стандартаў, нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі, яны абгрунтоўваюцца і пацвярджаюцца дзяржаўнымі ўстановамі і рознымі службамі. Бадай, ні адна галіна навукова-тэхнічнай дзейнасці не мае настолькі развітой сістэмы аб'ектыўных ацэнак, як вынаходніцтва. Да іх ліку трэба аднесці паказчыкі патэнта-ліцэнзійнай работы: тэхнічны ўзровень аб'ектаў тэхнікі; колькасць аб'ектаў, па якіх праведзена праверка патэнтнай чысціні; колькасць распрацовак або аб'ектаў тэхнікі, у якіх выкарыстаны вынаходніцтвы і г. д., а таксама паказчыкі, якія характарызуюць эфектыўнасць вынаходніцтва: паказчык абгрунтаванасці падачы заявак, колькасць пададзеных заявак на магчымыя вынаходніцтвы і прамысловыя ўзоры, эканамічны эфект, атрыманы ад укаранення вынаходніцтваў і тэм, выкананых на ўзроўні вынаходніцтваў і г. д.

Менавіта ў сілу сваёй аб'ектыўнасці гэтыя паказчыкі дазваляюць ускрываць моцныя і слабыя бакі ўсёй навуковай дзейнасці кафедр, лабараторый і асобных навуковых і інжынерных работнікаў.

Вось чаму, змагаючыся за паляпшэнне паказчыкаў па вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай рабоце, неабходна перш за ўсё павышаць якасць і эфектыўнасць навукова-даследчых работ у цэлым. Стварэнне высокаэфектыўнай тэхнікі, новых метадаў і прагрэсіўнай тэхналогіі на ўзроўні вынаходніцтваў павінна быць лагічным вынікам усяго хода работ, абумоўлівацца тэхнічным заданнем. Выкананне мерапрыемстваў па вынаходніцкай дзейнасці патрэбна разглядаць не як дадатковую «нагрузку», нейкую самамэту, а як эфектыўныя сродкі для паспяховага правядзення работ. Усё гэта ў поўнай меры адносіцца і да асобных навуковых і інжынерных работнікаў. Іх долевы ўдзел у вынаходніцкай дзейнасці падраздзялення, асабістыя паказчыкі характарызуюць іх як тэхнічных спецыялістаў у цэлым, адлюстроўваюць рэальны ўдзел у навукова-даследчай рабоце.

Увядзенне новага дзяржстандарта з 1 студзеня 1984 г. аб парадку правядзення патэнтных даследаванняў павінна павысіць адказнасць кафедр і лабараторый за ўзровень выконваемых работ і якасць патэнтных даследаванняў. Разам з тым, увядзенне гэтага стандарта, а таксама правядзенне патэнтных даследаванняў і зацвярджэнне плана мерапрыемстваў само па сабе не садзейнічае павышэнню якасці навуковых даследаванняў. Паспяховае выкананне задачы магчыма толькі пры выкарыстанні вынікаў гэтых даследаванняў і правільнай арганізацыі ўсяго комплексу работ, ініцыятыўных і творчых адносінах усіх работнікаў.

**В. ЯЦКЕВІЧ,**
**старшы навуковы супрацоўнік ГНДЛ.**



**Многія дыпломныя работы студэнты выконваюць з дапамогай вылічальнай тэхнікі універсітэцкага ІВЦ.**

**НА ЗДЫМКУ: дацэнт кафедры фізічнай метралогіі Р. К. Школдзіна і старшы інжынер інфармацыйна-вылічальнага цэнтра М. А. Цурганаў абмяркоўваюць вынікі ліку на ЭВМ СМ-4 і карэктыруюць праграмы для дыпломніка фізічнага факультэта Сяргея Гурскага.**

*Конкурсы*

## ПОСПЕХ СПАДАРОЖНІЧАЎ ДАПЫТЛІВЫМ

У гэтым годзе традыцыйны конкурс перакладчыкаў, арганізаваны кафедрай англійскай мовы, прысвячаўся барацьбе працоўных Велікабрытаніі супраць антынароднай палітыкі торы. У конкурсе прынялі ўдзел студэнты ўсіх факультэтаў.

Большасць удзельнікаў, а іх было 23, прадэманстравалі глыбокія веды англійскай граматыкі, паказалі сваё майстэрства ў пісьмовым перакладзе і вуснай размове.

Конкурс праводзіўся ў два туры. Спачатку студэнтам быў прапанаваны для пісьмовага перакладу арыгінальны тэкст па краіназнаўчай тэматыцы. Пераможцамі першага тура конкурсу перакладчыкаў прызнаны Юрый Аляксейчанка, студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта, Ларыса Каранькова, чацвёртакурсніца эканомфака і Наталля Ясюкевіч, студэнтка трэцяга курса матфака.

Другі тур уключаў субяседаванне па вусных тэмах «Барацьба за мір», «Жыццё студэнта». Журы конкурсу з задавальненнем адзначыла ў студэнтаў-удзельнікаў добрыя веды палітычнай і бытавой лексікі, хуткую англійскую размову, знаходлівасць і кемлівасць у цяжкія моманты субяседавання. Пераможцамі другога тура зноў сталі Ю. Аляксейчанка і Л. Каранькова. Ім было даверана адстойваць гонар нашага універсітэта на міжвузаўскай алімпіядзе па замежных мовах, якая праходзіла ў Гомельскім кааператыўным інстытуце. На ёй Ю. Аляксейчанка і Л. Каранькова занялі адпаведна другое і трэцяе месцы.

Мы віншуем пераможцаў і ўдзельнікаў алімпіяды і жадаем, каб у далейшым у нашых студэнтаў не зніжалася цікавасць да вывучэння замежных моў, а таксама традыцый культуры, палітычнага ладу іншых краін, каб не згасала іх дапытлівасць, працалюбства, імкненне перамагаць.

У будучым годзе запрашаем усіх жадаючых прыняць удзел у традыцыйным конкурсе.

**І. МІКУЛІЧ,**
**выкладчыца кафедры англійскай мовы.**

# групе

міжнароднай буржуазіі, мілітарызму і г. д.

Палітінфармацыя павінна стаць адным з галоўных мерапрыемстваў па контрпрапагандзе. Менавіта тут мы развенчваем выдумкі буржуазнай прапаганды, паказваем сапраўдную сутнасць буржуазнай маралі і дэмакратыі, заходняй масавай культуры, прапагандуем наш, сацыялістычны лад жыцця. Палітінфарматары павінны шырока прытрымлівацца прынцыпаў аб'ектыўнасці ў выкладанні матэрыялу, яго трактоўцы, гэта значыць, разглядаць падзею і з'яву ў развіцці, усвядомліваць іх прычыны і вытокі ва ўзаемасувязі з іншымі падзеямі і з'явамі.

Уважліва будуць слухаць таго палітінфарматара, які выказвае сваю асабістую думку, дае ацэнку, робіць прагнозы. Аднак усё гэта трэба засноўваць на дакладных фактах. Тут паўстае яшчэ адно важнае пытанне: як выступаць палітінфарматару — чытаць паведамленне з газет і каменціраваць іх або пісаць сваё выступленне загадзя і затым яго чытаць. Безумоўна, лічбы і іншы матэрыял, які цяжка запомніць, трэба запісаць. Усё ж астатняе трэба выкладаць па памяці. Палітінфарматар павінен глядзець у аўдыторыю, адчуваць яе пульс. Гэта будзе добрай школай аратарскага майстэрства выступаючага, і студэнты будуць больш уважліва і зацікаўлена слухаць свайго таварыша.

Пажадана ўказваць крыніцы, адкуль палітінфарматар чэрпаў матэрыял. Гэта пакажа таксама і ступень падрыхтоўкі выступаючага, адносіны да справы.

Для падрыхтоўкі тэматычнай палітінфармацыі можна звярнуцца да газет (у прыватнасці, «Знамя юности», «Чырвоная змена», «Гомельскі універсітэт»), дзе рэгулярна публікуюцца тэмы палітычных гутарак і палітінфармацый, указваюцца крыніцы матэрыялу для падрыхтоўкі да іх. Можна таксама і самастойна выбраць тэму палітінфармацыі.

Тэмы павінны прапаноўвацца палітінфарматарамі, іншымі студэнтамі, абмяркоўвацца на пасяджэнні камсамольскага бюро групы і зацвярджацца на групавым камсамольскім сходзе. Гэта робіцца з той мэтай, каб на палітінфармацыях абмяркоўваліся найбольш хвалюючыя пытанні міжнароднага і ўнутранага жыцця, каб падрыхтоўка да іх вялася пастаянна, а не за некалькі дзён. Палітінфарматары павінны загадзя азнаёміць студэнтаў групы з асноўнай праблематыкай палітзаняткаў, указаць крыніцы неабходнай інфармацыі. Гэта трэба рабіць для таго, каб кожны мог выказаць сваю думку, прымаў удзел у ажыўленай дыскусіі.

Цяпер хацелася б прапанаваць, на наш погляд, актуальную і цікавую тэматыку палітінфармацый. Бліжэйшыя палітінфармацыі могуць быць на наступныя тэмы: «Зямлю ад пажару зберагчы» (аб сусветным руху за мір), «Нікарагуанская рэвалюцыя: праблемы і перспектывы», «Лос-Анжэлес: спорт ці бізнес?» Прадметам абмеркавання на тэматычнай палітінфармацыі маглі б стаць нядаўна выдадзеныя цікавыя кнігі. Напрыклад, кніга-інтэрв'ю на міжнародныя тэмы Г. Арбатава і В. Олтманса «Вступая в 80-е...» і В. Трубнікава «Крах «Операции Полония», 1980—1981 гг.

У апублікаваным артыкуле не ўсе пытанні ўдалося асвятліць дастаткова поўна. Асноўная ўвага ўдзелена міжнароднай праблематыцы палітінфармацый. Прадбачу пытанне чытачоў: «Навошта так многа сказана аб правядзенні такой на першы погляд простай справы як палітінфармацыя?» Аднак, гэта толькі здаецца, што яна простая. На самой справе ўсё інакш. Палітінфармацыя з'яўляецца менавіта такой справай, да якой трэба падыходзіць з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю. Яна патрабуе пэўных ведаў, уменняў і навыкаў, нават майстэрства, якія неабходна пастаянна ўдасканальваць.

**Віктар ЛЮТЫНСКІ,**
**студэнт 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта, намеснік сакратара камсамольскага бюро па ідэалагічнай рабоце.**

## ТЫДЗЕНЬ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ

Учора пачаўся абласны тыдзень студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Яго праграмай прадугледжаны шматлікія конкурсы. У іх прымуць удзел і пераможцы універсітэцкіх аглядаў. Так, студэнты матэматычнага факультэта В. Некрашэвіч і В. Шведаў будуць аспрэчваць права называцца лепшым лектарам летніх атрадаў, а М. Кечанкоў з біяфака — асенніх. Студэнты гістфіла Т. Маслюкоў і І. Эсмантовіч выступяць у конкурсе знаўцаў гісторыі і традыцый СБА. Атраду імя М. Мароза з біяфака даверана абараняць гонар універсітэта ў аглядзе нагляднай агітацыі па палітычнаму афармленню лагера будатрада. СБА «Волаты» з фізічнага і «Алеся» з эканамічнага факультэтаў, механізаваны атрад «Колас», СБА «Дружба-84» з фізічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў выставяць для ўдзелу ў конкурсе свае агітбрыгады.

**В. ШЭВЕЛЕВА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола ГДУ па ідэалагічнай рабоце.**

